**Катэгорыя ладу** абазначае адносіны дзеяслоўнага дзеяння да рэчаіснасці. Вылучаюць тры лады дзеяслова: абвесны, загадны і ўмоўны.

**Абвесны лад** выражае сцвярджэнне або адмаўленне рэальнага дзеяння ў цяперашнім, прошлым ці будучым часе. Дзеясловы абвеснага ладу змяняюцца па часах, асобах і ліках, а ў прошлым часе – па ліках і родах. Прыклады сказаў з дзеясловамі абвеснага ладу: «**Чырванееецца** неба, чырвань з краю да краю» (П.Броўка). «Васіль **варухнуўся**, нібы адчуваючы стому» (І.Мележ). «Бывае, што хтосьці **пакіне** свой дом» (П.Броўка). Абвесны лад адрозніваецца ад астатніх ладоў найперш у тым, што мае формы часу.

**Загадны лад** выражае пабуджэнне (загад, заклік, просьба, парада, прапанова, пажаданне) да дзеяння. Загадны лад мае пяць формаў: 2-й і 3-й асобы адзіночнага ліку, 1-й, 2-й і 3-й асобы множнага ліку. Найбольш пашыранымі з'яўляюцца формы 2-й асобы адзіночнага і множнага ліку.

Форма 2-й асобы адзіночнага ліку мае разнавіднасці: дзеясловы з канчаткамі *-і* (*-ы*): «будзі», «ві», «кажы»; дзеясловы з нулявым канчаткам: «кіруй», «засявай», «адводзь». Форма 2-й асобы множнага ліку ўтвараецца ад формы 2-й асобы адзіночнага ліку шляхам далучэння постфікса *-це*: «вярніце», «апраніце», «грайце».

Форма 1-й асобы множнага ліку мае разнавіднасці: дзеясловы (формы сумеснага дзеяння) выражаюць загад пры адпаведнай інтанацыі. Параўн.: «**Пойдзем** у лес!» (выражэнне загаду) і «Заўтра **пойдзем** у лес» (выражэнне будучага простага часу абвеснага ладу); апісальнае выражэнне (часціца *давай* + дзеяслоў у форме будучага часу ці інфінітыва): «давай надрукуем», «давайце працаваць». Загадным з'яўляецца дыялектная форма з канчаткам *-ма* (у некаторых мовазнаўчых працах яна называецца постфіксам): «хаваймася», «станьма», «спяшаймася».

Формы 3-й асобы адзіночнага і множнага ліку аналітычныя. У іх утварэнні ўдзельнічаюць часціца *няхай* (*хай*) + дзеясловы цяперашняга ці будучага простага часу 3-й асобы адзіночнага або множнага ліку, якія страчваюць сваё часавае значэнне: «няхай піша», «хай пралятаюць», «няхай зайграе», «хай рэалізуюцца».

Форма загаднага ладу можа ўжывацца са значэннем: умоўнага ладу: «**Папрацуй** да поту – **паясі** ў ахвоту» (Прык.); абвеснага ладу: «От згубіцца і сядзіць цэлы дзень у чужых людзей. А бабка **ламі** галаву, **шукай**» (М.Лужанін).

**Умоўны лад** абазначае дзеянне, якое можа адбыцца пры пэўнай умове. Умоўны лад не мае формаў часу і асобы, а мае формы трывання, роду і ліку: «збіраў бы», «назбіраў бы»; «прыйшоў бы», «прыйшла б»; «несла б», «неслі б». Формы ўмоўнага ладу ўтвараюцца шляхам спалучэння часціцы *бы* (*б*) з формай прошлага часу: «**Паплыў бы** я, здаецца, хмаркі, разам з вамі» (Якуб Колас).

Форма ўмоўнага ладу можа ўжывацца са значэннем: загаднага ладу (для змякчэння катэгарычнасці загаду): «Ты, Мікола, па Валю **схадзіў бы**»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(Я.Брыль); абвеснага ладу: «Браты яго клічуць здалёку ўвесь час, пачуць ім **хацелася б** Райніса голас» (П.Броўка).

*Т.Я.Старасценка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ